# ПРАЙШОЎ ТЫДЗЕНЬ ПАМЯЦІ

Сёлета споўнілася б 98 гадоў з дня нараджэння П.М. Машэрава. З гэтай нагоды ў першай палове лютага ва ўніверсітэце традыцыйна прайшоў тыдзень памяці Пятра Міронавіча.

Пачалося мерапрыемства ў народным мемарыяльным пакоі-музеі П.М. Машэрава, дзе прысутнічалі не толькі выкладчыкі і студэнты ўніверсітэта, але і госці – прадстаўнікі Машканскай школы, кіраўнік Віцебскага рэгіянальнага цэнтра героіка-патрыятычнага выхавання моладзі «Пошук» Ларыса Навумаўна Бруева.

Тыдзень памяці адкрыла прарэктар па выхаваўчай рабоце Ірына Васільеўна Бондал, якая расказала не толькі пра жыццё П.М. Машэрава, але і пра жудасную аўтамабільную катастрофу, у якой ён загінуў. Перад прысутнымі таксама выступілі Ларыса Навумаўна, якая падзялілася ўспамінамі пра сваю сустрэчу з П.М. Машэравым падчас зорнага паходу, і кіраўнік школьнага гуртка «Памяць» Машканскай школы Таццяна Каранеўская, якая ў сваёй прамове адзначыла такія якасці свайго земляка, як чалавечнасць, спагадлівасць, гатоўнасць прыйсці на дапамогу. У першы дзень да мемарыяльнай дошкі Пятра Машэрава, якая размешчана на будынку ВНУ, былі ўскладзены кветкі ад прафкамаў студэнтаў і супрацоўнікаў універсітэта.

Акрамя таго, адбылося адкрыццё фотавыставы «Біяграфія Машэрава ў фотаздымках». А метадыст аддзела па выхаваўчай рабоце з моладдзю Вольга Уладзіміраўна Пуцеева правяла экскурсію для школьнікаў. Увазе прысутных таксама была прадстаўлена прэзентацыя патрыятычна-выхаваўчай работы з моладдзю на прыкладзе ўніверсітэта, УА «Машканская дзіцячы сад–сярэдняя школа імя А.К. Гараўца Сенненскага раёна», УК «Музей баявой садружнасці» (г.п. Расоны).

Першы дзень закончыўся таварыскім матчам па валейболе паміж камандамі Машканскай школы і ўніверсітэта.

Другі дзень тыдня памяці Машэрава праходзіў на малой радзіме Пятра Міронавіча. Студэнты 31-й групы матэматычнага факультэта (куратар С.У. Сяргеенка) у суправаджэнні В.У. Пуцеевай наведалі Машканскую школу, у якой вучыўся Пётр Міронавіч. Тут хлопцы і дзяўчаты пазнаёміліся з экспазіцыяй музея.

На трэці дзень тыдня памяці студэнты гістарычнага факультэта пабывалі ў Расонскім раёне, дзе пачалася працоўная і ваенная біяграфія Машэрава. Шмат цікавага пра Пятра Міронавіча даведаліся юнакі і дзяўчаты падчас экскурсіі па Музеі баявой садружнасці. Акрамя гэтага студэнты наведалі музей Клясціцкай школы.

У нашым універсітэце прайшлі інфармацыйныя гадзіны ў групах і стэндавыя прэзентацыі, дзякуючы якім можна было даведацца не толькі пра Пятра Машэрава, але і пра традыцыі правядзення зорных паходаў па машэраўскіх мясцінах, а таксама пра турыстычны патэнцыял Сенненскага і Расонскага раёнаў.

Правядзенне такога роду мерапрыемстваў – добрая нагода ўшанаваць памяць П.М. Машэрава, нашага земляка, выпускніка ВДУ, грамадскага дзеяча, славутага сына беларускай зямлі.

**Матэрыял падрыхтавала Анастасія БАЛТОЎСКАЯ, вучаніца 11 класа гімназіі №1 г. Віцебска.**